ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЕУ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

29 верасьня 1931 г. № 22[illegible] (149[illegible])

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ОРГАН ЦК І МЕНГАРКОМУ ЛКСМБ

ЗАМАЦАВАЦЬ ДАСЯГНУТЫ ПЕРАЛОМ

Гэтымі днямі скончыліся манэўры РСЧА. Манэўры праходзілі ва ўмовах, калі пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі мы дабіліся вялізарных перамог у індустрыялізацыі нашай краіны і пры нябывалым экономічным крызісе і шалёнай падрыхтоўцы інтэрвэнцыі супроць СССР у капіталістычных краінах.

Хутка два гады, як сусьветны капіталізм зацягнут моцным ланцугом крызісу, які ахапіў усе галіны прамысловасьці. Толькі адна ваенная прамысловасьць, у процівагу астатнім галінам, увесь час пашыраецца.

Крызіс зьяўляецца нябачаным па сваёй рэкорднай велічыні, глыбіні і зацяжнасьці.

Крызіс у прамысловасьці спадарожваецца нябачаным крызісам у сельскай гаспадарцы.

Клубок капіталістычнага крызісу ўсёй больш і больш заблытваецца, абвастраючы як унутраныя, так і міжнародныя супярэчнасьці ў капіталістычнай сыстэме.

„Да сусьветнага прамысловага крызісу, які спадарожваецца аграрным крызісам далучыўся вырасшы на глебе прамысловага і аграрнага крызісу крэдытна—грашовы крызіс. Апошні перарос у радзе краін у крызіс валютны („Правда").

Так на працягу вясны і лета 1931 году наступілі масавыя банкруцтвы, ахапіўшыя буйнейшыя аб'яднаньні і буйнейшыя банкі капіталістычнага сьвету.

Дзесяткі мільёнаў беспрацоўных, разбурэньне сялянства, сотні мільёнаў галодных і бескватэрных, апусьцелыя фабрыкі і заводы—вось да чаго прывяла капіталістычная сыстэма.

Нябачаны па сваёй глыбіні экономічны крызіс адбываецца ў час пасьпяховага будаўніцтва соцыялізму ў Савецкім Саюзе.

Посьпехі пяцігодкі—пуск вялізарных прамысловых гігантаў і нябачаны рост саўгаснага і колгаснага будаўніцтва, поўная ліквідацыя беспрацоўя, рост матар'яльнага дабрабыту рабочае клясы—з усёй яскравасьцю паказваюць перавагу савецкай сыстэмы гаспадаркі над сыстэмай капіталістычнай.

Існаваньне СССР—бяльмо на вачох капіталістычнага сьвету. Выхад з крызісу сусьветны капіталізм шукае ў войнах і ў першую чаргу супроць СССР

Ваенная небясьпека ўзрастае з кожным днём. Нябачанымі тэмпамі капіталізм за кошт наступу на працоўных узбройваецца для новых крывавых войн.

Вядучы цьвёрдую палітыку міру, мы павінны быць гатовымі да абароны краіны саветаў, памятаючы лёзунг тав. Сталіна: „чужой зямлі мы не жадаем, але і сваёй зямлі ні пядзі нікому не аддамо".

Манэўры РСЧА праходзілі пры вялізарным уздыме чырвонаармейскіх і працоўных мас Савецкай Беларусі. Сотні і тысячы заяў у партыю, комсамол і колгасы, ахоп соцспаборніцтвам і ўдарніцтвам, выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, здача хлеба праз чырвоныя абозы,—вось паказчыкі творчага ўздыму і адданасьці комуністычнай партыі чырвонаармейцаў, рабочых, колгасьнікаў і працоўнага сялянства.

Манэўры яшчэ раз паказалі, што Чырвоная армія ў любую хвіліну гатова да абароны краіны Саветаў.

Манэўры РСЧА і СПА зрабілілі значны пералом у ваенізацыі комсамолу. Гэты пералом мы павінны замацаваць, яшчэ больш узмацніўшы шэфства над паветраным і морскім флётам. Комсамольскія ячэйкі павінны зараз-жа распачаць падрыхтоўку да зімовай вайсковай вучобы, дабіваючыся, каб кожны комсамолец быў ахоплен вайсковай вучобай. Трэба цьвёрда запамятаць рашэньне IX зьезду УсеЛКСМ:—„У радох комсамолу не павінна быць месца тым, хто недаацэньвае неабходнасьць вайсковай падрыхтоўкі і тым, хто не праводзіць штодня вайсковай работы".

На парозе чацьвертага кварталу

„БАЛЬШАВІК" РАПАРТУЕ ЛІЧБАМІ ПЕРАМОГ

„Комунараўцы", вучэцеся ў „Бальшавіка" перамагаць

Падрыхтуемся да чацьвертага, апошняга кварталу

У чацьверты, апошні квартал трэцяга году пяцігодкі кожнае прадпрыемства павінна прысьці падрыхтаванымі для выкананьня адказных пляпаў апошняга кварталу.

Сёньня мы падводзім вынікі працы за трэці квартал. Адначасова з вялікай перамогай гарбарні „Бальшавік", якая паказала бальшавіцкія ўзоры барацьбы, „Комунар" прыходзіць з значным недавыкананьнем прамфінпляну трэцяга кварталу.

Задача ў чацьвертым квартале пакрыць запазычанасьць трэцяга і выканаць бягучы плян.

Мобілізуем усе сілы на выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну.

З рапарту ЦК КП(б)Б

ад рабочых, работніц, інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў і служачых чырвонасьцяжнага заводу „Бальшавік"

Гэроічнымі намаганьнямі ўсяго колектыву заводу, гэтых ленінскіх барацьбітоў за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі ленінскай комуністычнай партыі, мы ідзем ад перамогі да перамогі на фронце будаўніцтва соцыялізму.

26-IX мы датэрмінова скончылі выкананьне прамфінпляну павялічанай програмы (на 32,7 проц. у параўнаньні з першым паўгодзьдзем) трэцяга кварталу трэцяга рашаючага году пяцігодкі ў колькасьцях на 101,15 і ў цэнасьцях на 105,33 проц.

Замест вызначанага бюро партколективу і заўкомам тэрміну—27-IX мы выканалі програму 26-IX.

Гэтыя перамогі не выпадковыя. Гэта—вынікі штодзённай мобілізацыі мас на выкананьне задач будаўніцтва соцыялізму, гэта вынік правільнага кіраўніцтва партарганізацыі, гэта вынік высокай сьвядомасьці колектыву ўдарнікаў заводу.

На падставе ажыцьцяўленьня 6-ці ўмоў тав. Сталіна мы дабіліся вялікіх посьпехаў ва ўсіх галінах нашай работы. У галіне зьніжэньня сабекошту ў трэцім квартале мы далі 12,65 проц. замест плянавага 5,9 проц.

За 3-ці квартал паступіла 135 рабочых прапаноў, якія даюць каля 6.000 руб. экономіі.

Якасьць продукцыі ў нас паляпшаецца.

Прагулы за трэці квартал складаюць 0,09 проц. супроць 0,17 проц, у першым паўгодзьдзі.

Соцспаборніцтвам у нас ахоплена 92,1 проц. рабочых,- замест 86 6 проц на 1-VII-31 г. па 23х брыгадах праводзяцца зьменна-сустрэчныя 10-ці хвільныя вытворчыя нарады. Усе аддзяленьні пераведзены на гаспадарчы разрахунак. 12 брыгад вядучых профэсый таксама пераведзены на гаспадарчы разрахунак. Гэтыя брыгады адыгрываюць перадавую ролю на вытворчасьці і зьяўляюцца прыкладам для ўсіх астатніх брыгад.

Вакол манэўраў СПА мы разгарнулі вялізарную агітмасавую работу. Побач з гэтымі манэўрамі мы абвясцілі вытворчыя манэўры па датэрміновае выкананьне прамфінпляну трэцяга кварталу, па ўцягненьне ў працу лепшых ударнікаў і уключыліся ва ўсесаюзны конкурс на лепшае скур-абутковае прадпрыемства па выкананьню прамфінпляну другога паўгодзьдзя трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

За час манэўраў 39 лепшых ударнікаў падалі заявы аб уступленьні ў рады партыі, а за ўвесь трэці квартал—57 ударнікаў уступілі ў партыю. Больш 50 проц. з іх маюць дарэволюцыйны вытворчы стаж і 36 проц, маюць больш чым 5 гадовы вытворчы стаж. У комсамол уступіла за час манэўраў 14 чал, а за ўвесь трэці квартал—36 чал.

Мы памятаем словы тав. Молатава: „Менш хвастунства, больш сапраўднай гатоўнасьці да барацьбы за тэмпы

Мы ня спынямся на дасягнутых посьпехах, мы будзем яшчэ больш змагацца за павялічэньне тэмпаў, за зьнішчэньне ўсіх недахопаў у нашай рабоце.

Няхай жывуць ударнікі—сапраўдныя барацьбіты за соцыялізм!

Няхай жыве комуністычная партыя—організатар і кіраўнік пераможнага будаўніцтва соцыялізму ў нашай краіне і яе правадыр тав. Сталін!

Ад імя колектыву заводу:

Сэкратар бюро партколективу зав. „Бальшавік" ГЕЛЕР.

Старшыня заўкому КАНТАРОВІЧ.

Дырэктар заводу БАНДАРЧЫК.

У ЧАЦЬВЕРТЫМ

пакрыць запазычанасьць 3-га кварталу, выканаць плян бягучага

На колектыў заводу „Комунар" да пачатку 4-га кварталу ўскладаецца асабліва сур'ёзная і адказная задача—павысіць тэмпы працы з тае прычыны, што завод выходзіць з прарывам у выкананьні пляну 3-га кварталу.

Прамфінплян за жнівень выкананы на 80,7 проц. Ня гледзячы на тое, што „комунараўцы" склалі соцдагавор з падшэфнай вайсковай камандай, якім абавязаліся выканаць і перавыканаць верасьнёўскі плян, першыя дзьве дэкады верасьня далі толькі 21,2 проц, пляну. Ужо складзены агульна-заводзкі плян 4-га кварталу. Плян абгаворан ы ў кожнай брыгадзе, у кожным цэху і на агульна-заводзкім сходзе. Програма 4-га кварталу прадугледжвае выраб продукцыі на 1,368,432 руб.

Пры абгаварэньні пляну 4-га кварталу, якое саўпала з манэўрамі СПА тры брыгады механічнага цэху перашлі на гаспадарчы разрахунак, 15 маладых рабочых ударнікаў уступілі ў рады ЛКСМБ.

Значная конкрэтная праца праведзена ў галіне ажыцьцяўленьня ўказаньняў тав. Сталіна. Для організаванага набору рабочае сілы склалі дагавор з падшэфным Каралішчанскім сельсаветам і з падшэфнай вайсковай ротай на падрыхтоўку дэмобілізаваных чырвонаармейцаў для працы на заводзе.

У галіне паляпшэньня бытавых умоў рабочых яшчэ зроблена надзвычай мала. Каштоўнаю зьяўляецца праца комсамольскага колектыву заводу, які організаваў бытавую комуну з 45 маладых рабочых, што нядаўна прышлі на завод.

Організаваны на заводзе рабочы тэхнікум рыхтуе камандны склад вытворчасьці і павышае кваліфікацыю рабочых. Тэхнікум ахопіць 350 рабочых заводу. У тэхнікуме організавана нацменаўская яўрэйская група.

„Брыгада „Ч. З." Кавалевіч, Сабалеўскі

Рыхтуемся да чацьвертага кварталу

На намётках 4-га кварталу Менская абутковая фабрыка павялічвае прамфінплян з 4500 пар абутку да 5400 пар.

Першымі за ажыцьцяўленьне пляну ўзяліся комсамольцы. На агульных сходах пастанавілі раставіць комсамольцаў там, дзе адчуваецца прарыў у рабоце. Зараз прыняты меры да забясьпечаньня рабочымі закройнага цэху, у якім усё яшчэ адчуваецца недахоп рабочых-закройшчыкаў. Колькасьць рабочых павялічана да 1500 чал.

Значна дапамагла ў разгортваньні работы навокал новага прамфінпляну фабрычная шматтыражка. Газета мобілізавала на абгаварэньне прамфінпляну рабкораў.

Па ініцыятыве комсамольскай організацыі склікаецца агульна-фабрычная конфэрэнцыя рабочай моладзі для распрацоўкі прамфінпляну 4-га кварталу.

Як недахоп, трэба адзначыць марудны тэмп пераводу цэхаў на гаспадарчы разрахунак. Пераведзена ўсяго два цэхі: закройны і механічны.

Рабочыя фабрыкі рашылі ўключыцца ва ўсесаюзны конкурс на лепшае прадпрыемства па вырабу абутку. Комсамольцы абвясьцілі сябе мобілізаванымі на гэтую справу.

Л. ФРЫД

Поліцэйская дубінка кіруе перавыбарамі

Соцыял-фашысцкія банды зьбіваюць комсамольцаў у Намеччыне

Крывавыя выбары у Гамбургу

ГАМБУРГ. 27. Усю сёньнешнюю ноч напярэдадні выбараў у Гамбургскі парлямант, вуліцы Гамбургу былі перапоўнены дыскусыйнымі групамі. Соцыял-дэмократычныя рабочыя надта ўзбуджаны пераходам соцыял-дэмократычнага дэпутата рэйхстагу Этынгхаўза ў кампартыю і ажыўлена абгаварваюць гэтае пытаньне.

Поліцыя праяўляе надзвычайную нэрвовасьць. Учора ўвечары поліцыя заняла памяшканьне у раёне Гармоэк куды зьбіраюцца рабочыя. Усіх рабочых, якія там былі, поліцыя арыштавала, а таксама абыскала паасобных праходжых і арыштоўвала.

На адным з пляцоў Гамбургу 150 членаў соцыял-фашысцкай організацыі напалі на групу з 25 комсамольцаў. Ня гледзячы на тое, што комсамольцы былі ў меншасьці, яны пачалі абараняцца супроць нападу соцыял-фашыстых. У выніку сутычкі паранена 4 комсамольцы.


На 17 комсамольцаў, якія накіроўваліся на вэлёсыпэдах з Гармоэка ў Гамбург, напаў атрад нацыянал-соцыялістых (фашыстых) і пачаў зьбіваць комсамольцаў каламі, гумовымі палкамі і жалезнымі дубцамі. Трое комсамольцаў цяжка паранены.

Акрамя фашысцкага і соцыял-фашысцкага тэрору, рэволюцыйны пролетарыят Гамбургу церпіць бясконцыя рэпрэсіі з боку ўлады. Учарайшы нумар органу компартыі „Гамбургер Фольксцэйтунг" конфіскаваны.

Сёньня а 8 гадз. раніцы адбыліся сутычкі між рабочымі і поліцыяй.

НАГЛЯДАЛЬНІКІ З АМЭРЫКІ

Вышэйшыя чыноўнікі амэрыканскага ўраду ўказваюць, што з ПАЗШ намерваюцца выступіць супроць дзеяньня японцаў у Манчжурыі, спасылаючыся на вашынгтонскую згоду. (З газет)



Ліга нацый—толькі дэкорацыя

ШАНХАЙ. 27. Як паведамляе агенцтва Рэйтэр,, нанкінскія ўрадавыя колы ў надзвычай сумным настроі з повады паведамленьня аб рашэньні Лігі нацый не ўжываць ніякіх далейшых крокаў у сувязі са здарэньнямі ў Манчжурыі.

Кітайскі орган на ангельскай мове „Чайна прэс" у перадавым артыкуле заяўляе: „Кожны кітаец адчувае, што Ліга нацый уяўляе з сябе толькі дэкорацыю".

КОРАТКА

Па капіталістычнаму сьвету

* 4 верасьня ў г. Карсон Сіці (Амэрыка) упяршыню быў ужыты вопыт пакараньня сьмерцю пры дапамозе атрутных газаў замест электрычнага крэсла. Быў пакараны малады мэксыканец Чуі Чэхасья.

* Панічнае выйманьне золата з Нацыянальнага банку Даніі працягваецца. Вычарпаны ўсе, якія ёсьць у банку, запасы золата ў зьлітках. Патрабаваньне на залатую монэту дасягае агромністых памераў.

За 22 верасьня з Дацкага нацыянальнага банку было вынята золата на суму каля 4 мільёнаў крон. На парыскай біржы дацкая крона ўчора не котыравалася.

* Сёньня спыніла плацяжы банкаўская фірма „Штэнбэргер і Кампанія" у Бэрліне і Амстэрдаме, у сувязі з стратамі, якія банк пацярпеў ад падзеньня курсу ангельскага фунта.

* Курс фунта стэрлінгаў за 24 верасьня дасягнуў больш нізкага ўзроўню, чым у дзень офіцыйнага аб'яўленьня аб адмене залатога стандарту.

* Учора ў Нью-Ёрку фунт стэрлінгаў каштаваў 15 шылінгаў 9 пэнсаў, у Парыжы—15 шылінгаў 7 пэнсаў на радзе іншых эўропэйскіх бірж—15 шылінгаў 6 пэнсаў.

КОРАТКА

Па Савецкім Саюзе.

* На Касагорскім мэталюргічным заводзе сконструяваны электровозы з кузавам які можна пераварачваць. Гэта дало магчымасьць мэханізаваць увесь процэс падачы і згружваньня матар'ялаў у скіп доменнай печы.

* Рыбінскі завод „Дормашына" выпускае першы паравы каток для дарожнага будаўніцтва.

* Па ініцыятыве комсамолу заводу „Дынамо" выпушчан першы руднічны электровоз.

* Тысяча тэлефонаў устаноўлена ў раёнах для сувязі з сельсаветамі. Плян Наркомпаштэлю выканан на 200 проц.

* 5 мільёнаў руб. адпушчана на будаўніцтва дамоў райсаветаў ў Маскве.

* У гарадох Маскоўскай вобласьці будуюцца і намечаны к пабудове ў бягучым годзе 43 дамы для райвыканкомаў. На гэтае будаўніцтва адпушчана 2 млн 600 тысяч руб.

* На заводзе „Электрык" (Ленінград) пасьпяхова прайшлі іспыты электразварачнай машыны новага ўзору, прызначанай для выкананьня тонкіх работ па электразварцы. Машына сконструявана тэхнічнымі сіламі заводу.

„...Некалькі хвілін у бягучых справах..“

Колектывы ЛКСМБ Белдзяржбуду, заводаў „Зорка“ і „Кастрычнік“ опортуністычна недаацэньваюць політвучобу

20 верасьня, згодна пастановы ЦК ЛКСМБ, павінна была скончыцца ўся падрыхтоўчая работа да новага навучальнага году у кузьнях рэволюцыйнай тэорыі. Да гэтага тэрміну павінна было поўнасьцю закончыцца 100 проц. укомплектаваньне сеткі слухачамі, кіраўнікамі, методычным кіраўніцтвам бюро літаратурай і памяшканьнем.

Аднак, публікуемыя сёньня матар'ялы сьведчаць зусім аб іншым Колектывы заводаў „Зорка“ і „Кастрычнік“, а таксама камітэт Белдзяржбуду (Менск) опортуністычна ігноруюць політвучобу.

Раённыя камітэты, павінны прыняць рашучыя захады да тых, хто зрывае політвучобу, і забясьпечыць пачатак вучобы ў бліжэйшыя дні.

На заводзе „Зорка“ ігноруецца політвучоба

Бюро комсамольсага колектыву заводу „Зорка“ (Петрыкаўскі раён) ніколькі не падрыхтавалася да зімовай політвучобы. Політузровень большасьці комсамольцаў, асабліва навічкоў, вельмі нізкі. Даволі прывесьці адзін невялічкі факт. На запытаньне, што такое правы ўхіл, комсамолец Фэльдман адказвае: „Правымі называюцца таму, бо яны за колгасы і будаўніцтва соцыялізму“. На запытаньне, „хто стаяў на чале правага ўхілу“, адказвае: “Троцкі, Зіноўеў і інш.“.

Такіх політычна-няпісьменных комсамольцаў, як Фэльдман, на заводзе не адзінкі.

Калі на сходзе колектыву стаяла пытаньне аб політвучобе, дык сэкратар тав. Аксіцкі нават не зрабіў інформацыі аб значэньні політвучобы, абмежаваўшыся вылучэньнем трох чалавек для вярбоўкі ў комсамольскую школу.

Апоргу колектыву было даручана скласьці конкрэтны плян зімняй політвучобы але гэтага пляну ён ня склаў.

Падрыхтоўка пропагандыстых не праводзіцца і колектыў стаіць перад пагрозай адсутнасьці кадраў для школ. Ня выканана таксама разьвёрстка райкому на пасылку двух чалавек на курсы пропагандыстых.

Зубасты Грышка

Абмежаваліся вылучэньнем кіраўнікоў

Комсамольскі колектыў шклозаводу „Кастрычнік“ (Асіпавіцкі раён) не падрыхтаваўся да зімовай політвучобы. Кіраўнікі для заняткаў у політгуртках вылучаны, але самі гурткі па зьменах не організаваны. З 8 цэхавых ячэек ніводная не організавала гуртка політвучобы. Праграмы для заняткаў таксама ня складзены.

Партыйны колектыў не аказвае ніякай дапамогі комсамольскаму ў палаўжваньні з мовай вучобы.

Асі ав цкі РК ЛКСМБ павінен гэтым неадкладна зацікавіцца.

Брыгада „ЧЗ“ С. Бялінка і З. Вішнёвы

Заняцца неадкладна

Комсамольскі камітэт Белдзяржбуду зусім не падрыхтаваўся да зімовай політвучобы. Абсолютная большасьць цэхавых ячэек гэтым пытаньнем не занялася. Вялізарная кольмасьць навічкоў (каля 400 чал.) не ахоплены політвучобай і наогул ня ўключана ў комсамольскую работу. Ніякай практычнай работы як на вытворчасьці, так і ў ячэйках з імі не праводзіцца.

Прызначаны на 26 верасьня сход комсамольскага камітэту па пытаньню зімовай політвучобы, з-за галагацяпства бюро камітэту быў сарваны.

Менскі гарадзкі камітэт павінен зараз-жа зацікавіцца станам політвучобы і замацаваньня навічкаў у комсамольскім камітэце Белдзяржбуду.

Б.

ПАСТАНОВА

Бюро Менгаркому КП(б)Б ад 26-IX-31 г. аб выкананьні пастановы ЦК пра газэтныя кадры

Задачы, пастаўленыя перад цэнтральным друкам, патрабуюць сыстэматычнага палепшаньня складу яго працаўнікоў за лік лепшых рабкораў-ударнікаў, Менская гарадзкая організацыя КП(б)Б, як адна з перадавых організацый, павінна прыняць самы актыўны ўдзел у выкананьні пастановы ЦК КП(б)Б ад 23-V-31 г. аб газэтных кадрах.

Выходзячы з гэтага, бюро Менгаркому КП(б)Б пастанаўляе:

1. Вылучыць з ліку менскія рабкораў-ударнікаў 20 чал. на сталую адказную рэдакцыйную работу ў рэдакцыях цэнтральных газэт, з якіх 8 чал. для рэдакцыі „Зьвязда“.

Прапанаваць Культпропу Гаркому разам з аддзелам кадраў разьвярстаць тэрмінова гэту колькасьць паміж буйнымі вытворчымі партколектывамі. Партколектывам правесьці вызначаныя кандыдатуры праз рабочыя сходы.

2. Даручыць Культпропу Гаркому і партколектыву рэдакцый організаваць для падрыхтоўкі гэтых вылучэнцаў 6-ці тыднёвыя курсы.

3 Прапанаваць партколектыву рэдакцый цэнтральных газэт прыняць актыўны ўдзел ў вызначэньні кандыдатур і іх разьмеркаваньні.

4. Прапанаваць ячэйкам КП(б)Б БАН Усебеларускіх профкурсаў і партколектыву ВСНГБ прасачыць за работай і скарыстоўваньнем ў рэдакцыях прымацаваных асьпірантаў, курсантаў і гаспадарнікаў.

5, Парткому Комвузу прасачыць за своечасовым вызначэньнем студэнтаў на работу ў рэдакцыях у парадку практыкі.

6. Надаючы вялікае значэньне работе ў рэдакцыях газэт у парадку соцсумяшчэньня лепшых рабкораў-ударнікаў, а таксама спэцыялістых, гаспадарчых і профсаюзных работнікаў, лічыць работу ў рэдакцыях у парадку соцсумяшчэньня асноўнай грамадзкай нагрузкай. Фракцыі Гарпрофсавету даць паказаньне фабзаўкомаўцам.

7. Культпропу Гаркому КП(б)Б праз тры тыдні далажыць Бюро аб выкананьні гэтай пастановы.

8. Пастанову апублікаваць у друку.

У загоне

Комсамольская вучоба ў Таочынскай комсамольскай організацыі ў загоне. Комсамольскія ячэйкі гэтым пытан нем не займаліся. Прапрацоўка політмінімуму ў радзе ячэек праходзіць з вялікімі перабоямі, пры малой колькасьці слухачоў. 75 проц. к-цаў політычна няпісьменныя і малапісьменныя.

Вячэрнія політшколы, пачатковыя школы і гурткі на вывучэньню бягучай політыкі ў раёне не організаваны. Пост „Ч. З.“—Генін

Загрузіць ямы зялёным бульбянікам

Комсамольскія ячэйкі павінны ўзяць на сябе ініцыятыву выкасіць увесь бульбянік для сілосу

Плян сілосаваньня па БССР выканан каля 15 проц. Тэрмін сілосаваньня пустазельля прайшоў. Зараз трэба выкарыстаць на сілос атаву і бульбянік.

На БССР засеяна 560464 га бульбы, якая дае 1700 тысяч тон зялёнай масы—бульбяніку. Комсамольскія ячэйкі саўгасаў, колгасаў і малочна-таварных ферм павінны па баявому організаваць сілосаваньне бульбяніку. Трэба зараз-жа выкасіць увесь бульбянік і закласьці ў ямы.

Бульбянік зараз ратуе плян сілосаваньня.

Заданьне выканалі

Ельсі. Комсамольская ячэйка колгасу „Н-Бакаў“ Каменскага сельсавету па-бальшавіцку змагаецца за сілос. Організаваны комсамольскія ўдарныя брыгады. Брыгады выканалі і запоўнілі сілоснаю масай дзьве ямы на 30 тон.

Работу комсамольцы праводзілі на аснове сац. спаборніцтва і ударніцтва. У брыгады была ўцягнута беспартыйная моладзь і дарослыя колгаснікі.

Дзьве сілосных ямы на 30 тон сілосу кожная цалкам забясьпечваюць патрэбу колгаснай жывёлы ў корме.

Царенка і Балацэй

Плян выканалі на 170 проц.

Колгас „Чырвоны сьцяг“ (Віцебскага раёну) пры дапамозе комсамольскай ячэйкі перавыканаў плян сілосаваньня на 50 проц. і на 18 дзён раней тэрміну. Комсамольцы і колгаснікі пачалі будаваць звыш пляну адну траншэю на 20 тон сілосу. Па сустрэчнаму плян сілосаваньня выканан на 170 проц. Колгаснікі „Чырвонага сьцягу“ выклікаюць наследваць іхняму прыкладу астатнія колгасы Шумлінскага сельсавету.

З. Ваўчок

Узяць раўненьне на перадавых

Глуск. 28-9 (БЕЛТА). Сілосныя культуры ўжо даўно высьпелі, а бульбянік пачынае жаўцець. Але Глускі раён з сілосаваньнем не сьпяшае. Колгасы раёну выканалі плянавае заданьне толькі на 15,9 проц.

Будаўніцтва сілосных установак выканана ўсяго на 55,4 проц.

Колгасы імя 1-га мая—Акцябрскага сельсавету, „Чырвоная зорка“—Катковіцкага сельсавету сілосаваньне сарвалі. Толькі колгасы імя Молатава, „Комсамольская Праўда“ паказалі ўзоры ўдарнай работы выканалі пляны.

Ударныя брыгады ў барацьбе за сілос

Стара-Барысаўская ферма ЦРК шпаркімі тэмпамі праводзіць сілосаваньне кармоў. Па пляну трэба засілосаваць 900 тон, зараз засілосавана 680 тон. Да першага кастычніка комсамольская ячэйка і кіраўніцтва фермы абавязаліся поўнасьцю выканаць плян.

Кожны дзень працуюць ударныя брыгады.

Комсамолія фермы апраўдвае назву шэфа сілосаваньня. Ул. Бурда

Не марудзіць з закладкаю масы

У Сакалішчынскім сельсавеце (Расонскага раёну) сілосаваньне праходзіць самацёкам. Закладку сілосу пачалі толькі 4 з 13 колгасаў.

У колгасе „Чырвонае сакалішча“ ня ведаюць, як сілосаваць. Праўленьне не паслала на курсы свайго чалавека. Сілосную масу заклалі на працягу 10-ці дзён, мала перспэктыў, што сілос будзе добры.

Комсамол павінен напружыць усе свае сілы, каб не зацягваць закладку масы. Я. Шпакоўскі

ПЛЯН БУДЗЕ ВЫКАНАН

Малочная ферма Дубровенскага гарпо сарвала сілосаваньне. Комсамольская міжсаюзная ячэйка ўзяла на сябе ініцыятыву ліквідаваць прарыў. На сходзе ячэйка вынесла пастанову, каб кожны комсамолец адпрацаваў выхадны дзень. Організавалі дзьве комсамольскія брыгады па сілосаваньню: першая брыгада з 26 асоб 5-га верасьня адпрацавала адзін дзень, 15 верасьня адпрацавала і другая брыгада.

У выніку ініцыятывы комсамольскай ячэйкі ферма канчае сілосаваньне. ЦЫРАЛЬСОН

Праўленьне колгасу сарвала сілосаваньне

Колгас „Новы селянін“ (Стара-Дарожскі раён) павінен засілосаваць 150 тон. Аднак, засілосавана толькі 28-30 тон. Пустазельле прапала на корані.

Комсамольцы ўзялі ініцыятыву выкапаць яму і вышлі на працу. Але праўленьне колгасу суняло іх заявіўшы, што „няма чаго сілосаваць“.

Райколгассаюз павінен прыняць рашучыя меры да зрыўшчыкаў сілосаваньня. М. Ш.

Сартоўка саломы перад мочкай

Перад замочкай мачыльшчыку неабходна ўсю партыю саломы перагледзець. Калі сартоўка па снапох у полі не праводзілася, дык абвязкова правесьці яе перад замочкай. Снапы, неаднолькавыя па даўжыні, таўшчыні і колеру, неабходна замачваць ці ў асобнае мачыла (калі партыя падбярэцца), ці ў адно мачыла, перагарадзіўшы толькі сорт ад сорту парканам з жэрдак, убітых у дно мачыла.

Сартоўка праводзіцца шпарчэй і прасьцей, калі церабленьне вялося вучасткамі, у адзін сноп зьвязвалі аднародную салому.

Загрузка ў мачыла

Калі мочка праводзіцца летняя ці раньня-асеньняя, дык загружаць лён у палепшаныя і простыя мачылы трэба верхавінкамі наверх. У выпадку-ж позьняй мочкі снапы загружаюць камлямі наверх.

У культурных мачылах—зрубах—загрузку снапоў праводзіць заўсёды ў лапу. У зрубах, у якіх праводзіцца зьмена вады ў час мочкі, ці мочка з слабым пратокам снапы трэба загружаць шчыльна і роўнамерна па ўсім мачыле.

Пакрышка снапоў у мачыле

Загружаныя ў мачыле снапы трэба добра пакрыць без прасьвету, бо пры няроўнамернай пакрышцы снапы пад дзеяньнем сьвятла буреюць, што вядзе да атрыманьня стракатага валакна.

ЯК МАЧЫЦЬ ЛЁН

Пакрышку снапоў у копанцах можна рабіць з іржанай саломы, ці ільнянай путаніны, зьверх якое пакласьці дошкі і на іх ужо камяні.

У палепшаных і культурных мачылах снапы пакрываюць саломай ці путанінай, зьверху ўкладваюць дошкі, усё гэта замацоўваюць пад напускі зрубу ўпорынамі. Дзярном ні ў якім выпадку ня можна нагнятаць, бо дзёран размакае і моцна гразьніць мачыла і лён.

Калі ў мачыле замачваецца некалькі рознародных партый, дык пакрываць саломай і дошкамі трэба кожны сорт асобна, каб кожны сорт па меры яго гатоўнасьці можна было выгрузіць, не чапаючы іншых сартоў.

Канец мочкі ільна

Самым адказным момантам мочкі зьяўляецца правільнае вызначэньне яе канца. Мочку ня трэба даводзіць да канца, а канчаць яе ў час аддзяленьня тэхнічнага валакна ад драўніны. Калі мочку працягваць далей, дык наступае перамочка, таму што бактэрыі разбураюць спаі, якія злучаюць простыя валаконцы міжсобку.

Каб атрымаць валакно добрай якасьці, неабходна ўважліва сачыць за ходам мочкі і правільна ўстанавіць канец яе. Няправільнае вызначэньне канца мочкі цягне за сабой поўную страту валакна, а часам і поўную страту ільна.

Ільнаводы часта губяць свой лён, не зьвяртаючы ўвагі на стан саломы ў мачыле, кіруючыся пры выгрузцы ільна толькі той колькасьцю тыдняў, на працягу якіх лён мокне.

Чым цяплей вада, тым хутчэй лён вымакае. Дажджы таксама паскараюць мочку, бо ад дажджоў, як кажуць ільнаводы, „лён перапдае“ што тлумачыцца няроўнамерным памяншэньнем "квасласьці мачыльнай вадкасьці на паверхні і ў глыбіні мачыла, а таксама і частковым змываньнем валакна ў снапох, якія ляжаць бліжэй да паверхні. Таму, асабліва ў цёплы час, калі вялікая пена спадае і на паверхні мачыльнай вадкасьці ствараецца плеўка, з гэтага часу неабходна ўважліва сачыць за станам саломы, бяручы спробы ільна. Спробы бяруцца з некалькіх месц мачыла, каб склалася больш правільная сярэдняя спроба.

Па сырой спробе адзнакі гатоўнасьці ільна наступныя: 1) сьцёблы сьлізкія і мягкія. 2) пры праглядзе жмені на сьвет сьцёблы павуціняцца, 3) пры надаваньні сьцябла ён ня гнецца, а ламаецца з лёгкім трэскам, 4) пры зацiску ў камлі сьцябла двома пальцамі (паказацельным і вялікім) і пры працягваньні яго ўверх ільнянае валакно лёгка, без затрымкі аддзяляецца ад драўніны да самай макушкі сьцябля, 5) калі пераламіць сьцябло ў двух мясцох на адлегласьці 10—12 сантымэтраў і пацягнуць за драўняны цыліндар пальцамі, дык ён лёгка, без затрымкі выцягваецца.

Адной толькі сырой спробай нельга вызначыць канец мочкі. Неабходна пробу высушыць, зьмяць, атрапаць толькі на падставе сухой пробы можна вырашаць пытаньне аб заканчэньні мочкі.

Калі мочка вядзецца не да канца, а з адлежкаю на сьцішчы, дык выгружаць лён з мачыла можна з невялікай недамочкай, г. зн. калі кастра ня зусім яшчэ добра адыходзіць ад валакна, а з невялікай прытрымкай. Зьмешаную мочку можна весьці з такім разьлікам, каб адлежка працягвалася ня больш 10—12 дзён. З вялікай недамочкай можна выгружаць толькі тады, калі ў мачыле з прычыны нізкай тэмпэратуры мачыльнае вадкасьці мочка прыпыняецца і пачынаецца правільнае вызначаньне яе канца. Мочку працягваць няма сэнсу, а трэба лён выгрузіць і разаслаць.

Калі-ж мочка вядзецца да канца, выгружаць лён трэба, калі па сухой спробе будзе цалкам і лёгка аддзяляцца кастра ад валакна а знадворны выгляд яго будзе зусім таварным.

У выпадку недатрымкі ільна ў мачыле ён страціць у якасьці, бо пры сушцы ў капэлях праходзіць толькі адбелка валакна.

Колгасам, якія будуць вымочваць лён у сябе, неабходна вылучыць сталы кадр мачыльшчыкаў, якія з году ў год будуць удасканальвацца бо толькі ўмелае назіраньне над мочкай дасьць магчымасьць атрымаць добраякаснае валакна.

Аграном А. К. Перфільева „К-ст“

Нам. адказн. рэдактара С. АНІСАЎ.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38. Тэлефоны: рэдактара—7-25, сакратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэл. № 903. ГОД ВЫДАНЬНЯ XI.

Друкарня імя тав. Сталіна. Галоўлітбел № 599.